**БЕЛАРУСЬ
ПРАЗ ПРЫЗМУ
РЭГІЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ**

# Бяроза
# і Бярозаўскі
# рэгіён



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

**БЕЛАРУСЬ
ПРАЗ ПРЫЗМУ
РЭГІЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ**

# Бяроза і Бярозаўскі рэгіён

pawet.net

Мінск
«Беларуская навука»
2014

УДК 94(476.7)
ББК 63.3(4Бен)
Б43

Укладальнікі:
А. А. Скеп'ян, *адк. рэдактар* (Інстытут гісторыі НАН Беларусі)
А. Б. Доўнар (Інстытут гісторыі НАН Беларусі)

Рэдакцыйная калегія:
А. А. Каваленя, *старшыня*; В. В. Даніловіч; В. Л. Лакіза; А. А. Скеп'ян, *адк. рэдактар*; В. Ф. Голубеў; А. Б. Доўнар; В. М. Ляўко

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук Г. Я. Галенчанка,
доктар гістарычных навук Ю. М. Бохан

*Зборнік падрыхтаваны ў рамках выканання падпраграмы 1 «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа», у рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011-2015 гг. «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі (ДПНД «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава»). Навуковы кіраўнік праграмы – доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя).*

**Беларусь** праз прызму рэгіянальнай гісторыі : Бяроза
Б43 і Бярозаўскі рэгіён : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. / уклад. : А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар, рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 403 с. : іл.
ISBN 978-985-08-1785-3

Зборнік прысвечаны розным аспектам гістарычнага развіцця Бярозаўшчыны, самой Бярозы і яе ваколіц. Асноўная ўвага надаецца найбольш вядомай фундацыі К. Л. Сапегі – бярозаўскаму кляштару картузаў, яго гісторыі і лёсу. Зборнік змяшчае артыкулы беларускіх і замежных даследчыкаў.

Адрасаваны прафесійным гісторыкам, выкладчыкам і ўсім тым, хто цікавіцца рэгіянальнай гісторыяй Беларусі.

**УДК 94(476.7)**
**ББК 63.3(4Бен)**

**ISBN 978-985-08-1785-3**

© Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2014
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2014

pawet.net

# ЗМЕСТ


**Пералік скарачэнняў** ... 3

**Ад укладальнікаў** ... 5

**Уступнае слова дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдата гістарычных навук, дацэнта Вячаслава Віктаравіча Даніловіча** ... 8

**РАННЯЯ ГІСТОРЫЯ БЯРОЗАЎШЧЫНЫ**

***Алена Калечыц (Мінск)*** Археалагічныя помнікі Бярозаўскага раёна – крыніцы для ўзнаўлення гісторыі першапачатковага засялення края ... 12

***Ольга Князева (Минск)*** Территория и поселения Березовского района в XIV–XVI вв. ... 26

***Сяргей Рыбчонак (Мінск)*** Да радаводу ўладальнікаў Бярозы ў першай палове XVI ст. ... 38

**СПАДЧЫНА САПЕГАЎ**

***Алег Дзярновіч (Мінск)*** Бярозаўская картузія як мемарыяцыя Сапегаў: археалагічнае даследаванне кляштара ... 57

***Dorota Piramidowicz (Warszawa)*** «Kartuzja wielce kształtna <...> na wzór warownej twierdzy» – zespół kartuzów w Berezie w XVII wieku ... 94

***Мікола Волкаў (Мінск)*** Умацаванні кляштара картузіянцаў у Бярозе і распаўсюджанне старагаландскай фартыфікацыйнай сістэмы ў ВКЛ ... 111

***Ганна Паўлоўская (Варшава)*** Гісторыя кляштара картузіянцаў у Бярозе. 119

***Любовь Зорина, Сергей Козуля (Гродно)*** Портреты картузских монахов из гродненских музеев ... 140

***Инна Томашева (Минск)*** Скульптура костела монастыря картезианцев в Березе ... 144

*Валентина Смеян (Минск)* О результатах проведенных комплексных научных исследований и работах по реставрации памятника архитектуры «остатки монастыря картезианцев в г. Береза» ........ 151

*Аляксей Шаланда (Мінск)* Гербы Казіміра Льва Сапегі – фундатара Бярозаўскага картузіянскага кляштара........ 160

*Rafał Witkowski (Poznań)* Kontakty kartuzów bereskich z ludnością Polesia (XVII–XVIII ww.)........ 168

## БЯРОЗА І ЯЕ ВАКОЛІЦЫ ў XVIII – НАЧАТКУ XX ст.

*Валянцін Голубеў, Аляксандр Доўнар (Мінск)* Уладанне Бяроза паводле інвентара 1767 г........ 186

*Paweł Szymon Towpik (Ochla, Polska)* Ludność miasta Berezy oraz ludność w wiejskich dobrach klasztoru i Bereskiej plebanii, w granicach Bereskiej rzymskokatolickiej parafii, ze szczególnym uwzględnieniem miejskich poddanych zakonu kartuzów, na podstawie rewizkiej skazki z 1795 roku (wybrane zagadnienia)........ 208

*Александр Кенда (Малеч, Березовский р-н)* Метрические книги униатских церквей Березовщины XVIII – первой трети XIX в. из фондов ЛГИА и РГИА как источник по истории региона: общая характеристика, направления и перспективы исследований (на примере книг Малечской униатской церкви)........ 235

*Таццяна Кухаронак (Мінск)* Калядны абрадавы комплекс Бярозаўшчыны........ 255

*Іван Сацукевіч (Мінск)* Урбананімія Бярозы ў XX ст. ........ 276

## БЯРОЗА Ў XX СТАГОДДЗІ

*Вольга Волкава (Мінск)* Бяроза ў завірусе Першай сусветнай вайны........ 285

*Валерый Калясінскі (Мінск)* Асаблівасці кааператыўных манет польскіх вайсковых частак, раскватараваных у Бярозе Картузскай (1925 - 1939)........ 301

*Всеволод Юргенсон (Минск)* Денежное обращение и денежные суррогаты Березы в межвоенный период........ 306

*Ирина Вавренюк (Брест)* Евреи в жизни города Береза (1921–1939)........ 311

*Віталь Гарматны (Баранавічы)* Правядзенне камасацыі ў вёсцы Блудзень гміны Бяроза-Картузская Пружанскага павета Палескага ваяводства ў 1927–1933 гг........ 324

***Сергей Восович (Брест)*** Православные приходы Березовщины в конце 1920-х гг. .................................................. [illegible]

***Эммануил Иоффе (Минск)*** Знаменитые евреи — уроженцы Березы и Березовского района.................................................. [illegible]

***Николай Токарев (Минск)*** Академик Н. О. Горин. Страницы жизни и деятельности .................................................. 360

***Аляксей Літвін (Мінск)*** Бяроза і Бярозаўскі раён у гады Вялікай Айчыннай вайны: стан гістарыяграфіі і перспектывы даследавання .................. [illegible]

***Дмитрий Дьяков (Минск), Василий Шульга (Береза)*** Функционирование Березовского аэродрома .................. [illegible]

**Спіс аўтараў** .................................... [illegible]

# *СПАДЧЫНА САПЕГАЎ*

**Алег Дзярновіч** *(Мінск)*

## БЯРОЗАЎСКАЯ КАРТУЗІЯ ЯК МЕМАРЫЯЦЫЯ САПЕГАЎ: АРХЕАЛАГІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ КЛЯШТАРА

### *Аўтарскае адступленне*

Прайшло амаль 20 гадоў з часу археалагічнага вывучэння кляштара картузаў у Бярозе, калі мне давялося паглядзець дакументальную стужку нямецкага рэжысёра Філіпа Гронінга (Philip Gröning) «Вялікае маўчанне» («Le Grand Silence»), прысвечаны сучаснаму жыццю манахаў-картузаў. Філіп Гронінг здымаў свой фільм на працягу 2005 г. у казачна прыгожых французскіх Альпах у Grande Chartreuse – кляштары картузіянцаў (ці, інакш, картузаў), першага з кляштараў аскетычнага манаскага закону. У 1984 г. нямецкі рэжысёр накіраваў у картузіянскі ордэн ліст з просьбай дазволіць яму зрабіць дакументальны фільм пра іх. Манахі адказалі, што возьмуць час падумаць і самі звернуцца да Гронінга. Прайшло 16 гадоў, і з Ордэна паступіла паведамленне, што яны гатовыя. Рэжысёр сам, без асістэнтаў і каманды, пражыў шэсць месяцаў у кляштары, здымаючы штодзённыя малітвы, працы, рытуалы і рэдкія вонкавыя выправы манахаў. Аўтар фільма не столькі адлюстроўваў жыццё кляштара, як імкнуўся перадаць яго духоўную атмасферу. Па-за кадрам няма ні музыкі, ні галасоў – толькі гукі кляштара, насельнікі якога далі зарок маўчання. Тое, што застаецца, агаломшвае – толькі час, месца



pawet.net

і святло. У Вялікім Маўчанні губляецца мяжа паміж экранам і гледачамі. Гэта больш развагі, чым дакументальны фільм[111].

### *Сціслая гісторыя ордэна картузаў*

Першы прыстанак картузаў быў заснаваны св. Бруна Кёльнскім у 1084 г. у Шартрэзскіх гарах (французскія Альпы) паблізу Грэнобля. Назва Ордэна паходзіць ад назову першага кляштара – Вялікая Шартрэза (La Grande Chartreuse), на лаціне – Cartusia. На працягу 1122–1127 гг. Гвіга, пяты прыёр кляштара ў Шартрэзе, стварыў Рэгулы (Consuetudines) грамады, якія сталі Статутам усіх кляштараў, што прынялі правілы, прапанаваныя С. Бруна. Афіцыяльна статут ордэна картузаў быў зацверджаны Папам Рымскім Інакенціем III у 1133 г.

Ордэн існаваў напачатку толькі ў Францыі, але ў перыяд з канца XII па канец XIV ст. кляштары картузаў пашырыліся па ўсёй Еўропе – ад Ірландыі да Польшчы. Пікам развіцця Ордэна стаў канец XVI ст., калі ў свеце налічвалася 196 кляштараў.

Ордэн картузаў (Ordo Cartusiensis, O Cart.) – самае закрытае манаскае брацтва ў Рыма-Каталіцкай Царкве[112]. Іхны Статут патрабуе зарокаў самотнасці і маўчання, займацца духоўным удасканаленнем і фізічнай працай, уводзіць істотныя абмежаванні ў ежы. Картузы вядуць напаўпустэльніцкае і строга сузіральнае жыццё. Натхнёныя досведам бацькоў-пустэльнікаў, картузы жывуць, ажыццяўляючы сінтэз пустэльніцтва і жыцця ў грамадзе, злучаючы перавагі абодвух гэтых шляхоў, змякчаючы суро-

---

[111] Рэцэнзент «The New York Times» адзначаў: «The psychology and philosophy of asceticism are not Mr. Gröning's concern. He is after something more elusive and, from an aesthetic as well as an intellectual point of view, more valuable: a point of contact with the spiritual content of intense religious commitment. He finds it by means of a visual style and an editing scheme that match the feeling and structure of the days and seasons as they pass through the charterhouse» (*Scott A. O.* Lives Lived at a Monk's Pace, Allowing Time for the Spirit to Flourish // The New York Times. 2007. 28 February.).

[112] Даволі падрабязную бібліяграфію гл.: *Witkowski, R.* Saeculum Cartusiae Berezanae // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia Historica. T. VII. Poznań, 1997. S. 177, przyp 3; S. 178, przyp. 9; Гл. таксама: Христианство: энцикл. слов. / под ред. С. С. Аверинцева. М., 1993. Т. 1. С. 693.

васць абсалютнай адзіноты супольным укладам. Такім чынам, удалося аб'яднаць пустэльніцкае жыццё з штодзённай сумеснай літургіяй, адзіноту з духам братэрства, знайсці раўнавагу паміж самотніцтвам і грамадою. Аднак жыццё манахаў-картузаў праходзіць пераважна ў самоце. Аснову духоўнасці картузаў складаюць поўны адыход ад свету, сузіральнае жыццё ў вялікай, амаль вечнай маўклівасці, адзінота, суровы аскетызм і сталае малітоўнае служэнне. «Нашае таварыства, па сутнасці, заснаванае дзеля сузіральнага жыцця, таму павінна добрасумленна выконваць ізаляцыю ад знешняга свету» (рэгулы). Але духоўная свабода застаецца неад'емным прынцыпам супольнасці картузаў.

Кожная манаская келля (эрэм) складаецца з кубікула, ці жылога пакоя, дзе манах моліцца, спіць і есць; асобнага садзіка; майстэрні; прыбіральні. Застаючыся ізаляванымі адна ад адной, усе келлі маюць выхад у супольную галерэю, злучаную з царквой. Набажэнства займае ў картузаў большую частку дня і ночы. Картузы не ўжываюць мяса нават у выпадку хваробы, а раз на тыдзень маюць пост, харчуючыся толькі хлебам і вадой. У картузаў няма супольных памяшканняў для трапезы. На працягу вялікай часткі года манахі-пустэльнікі харчуюцца раз на дзень, атрымліваючы ежу праз асобнае вакенца ў амбулаторыі – галерэі. Гэтае вакенца мае два павароты – каб ні з кім не сустрэцца.

Картузы найстражэйшым чынам выконваюць зарок маўчання, аднак падчас штотыднёвага «спатымента» – энергічнага трох- ці чатырохгадзіннага шпацыру, браты вольна гутараць адзін з адным. Манахі ніколі не пакідаюць ваколіцаў свайго кляштара і не ўдзельнічаюць у ніякім служэнні. На працягу дзевяцісотгадовай гісторыі Ордэна іхны вобраз жыцця практычна не змяніўся. Строгасць рэгулаў зрабіла Ордэн картузаў адносна нешматлікім і ў поўнай ступені элітарным.

Манахі-браты прысвячаюць сябе служэнню манахам-айцам і падзяляюць той самы ідэал яднання з Богам. Клапоцячыся пра задавальненне матэрыяльных патрэбаў кляштара, яны робяць магчымым самотнае жыццё манахаў-айцоў, якія не могуць пакідаць свае келлі дзеля працы. Тым не менш манахі-браты звычайна працуюць у адзіноце і таксама вядуць пераважна самотнае жыццё.

Картузы займаюцца рамествамі і перапісваннем кніг, а па сваім адукацыйным статусе яны стаяць вышэй за ордэны манахаў-жабракоў. Картузы славяцца сваёй дабрачыннасцю, а сусветную вядомасць атрымаў іхны эліксір даўгалецця – зёлкавы ліквор «Шартроз».

## *Казімір Леў Сапега – фундатар Бярозаўскай Картузіі*

Ключавой фігурай для гісторыі заснавання Картузіі ў Бярозе, адзіным кляштары картузаў у Вялікім Княстве Літоўскім, з'яўляецца Казімір Леў Сапега[113] (15.07.1609 – 19.01.1656), чацвёрты, наймалодшы сын слыннага канцлера ВКЛ Льва Сапегі. Бацькам яму была забяспечана добрая адукацыя – ён навучаўся ў Віленскай акадэміі, езуіцкім калегіуме ў Мюнхене, а таксама ва ўніверсітэтах – Інгальштацкім, Лювенскім, Балонскім, Падобна, валодаў 7 мовамі[114]. Кар'ера Казіміра Льва на Радзіме была таксама паспяховай – ён абіраўся паслом на соймы, дэпутатам Трыбунала ВКЛ. Ад 1631 да 1637 г. ён выконваў функцыі каралеўскага сакратара і вялікага пісара ВКЛ, а з 1637 да 1645 г. быў маршалкам дворным. У 1645 г жа ён стаў падканцлерам ВКЛ. Маёмасныя магчымасці Казіміра Льва былі сапраўды вялікімі, акрамя сямейных маёнткаў, ён мог распараджацца сродкамі і ад некаторых дзяржаўных староستваў – ён з'яўляўся гарадзенскім (1631–1636), слонімскім (1644–1651), рагачоўскім старастам. Кароль Ян Казімір у чэрвені 1649 г. перадаў падканцлеру ВКЛ вельмі прыбытковую берасцейскую эканомію. Для нашага сюжэта вельмі важны той факт, што на сваім браце Яне Станіславе Казімір Леў атрымаў вялікую фамільную маёмасць у Берасцейскім вая-

[113] [*Gorczak B.*] Sapiehowie. Materiały historyczno-genealogiczne i majątkowe. Petersburg, 1891. T. 2. S. 13–45; *Ożarowski K.* Les Sapieha: etude généalogique. Wilna, 1872. S. 13–14; *Rachuba A.* Sapieha Kazimierz Leon (Lew) // PSB. T. 35/1. Z. 144. S. 31–37; Urzędnicy centralni i dostoynicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy / oprac. H. Lulewicz i A. Rachuba // Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku. Spisy / pod red. A. Gąsiorowskiego. T. XI. Kórnik, 1994. S. 74, 77, 136, 148, 238; Вялікае княства Літоўскае: энцыкл.: у 3 т. Мінск, 2006. Т. 2. С. 548.

[114] *Rachuba A.* Sapieha Kazimierz Leon. S. 31.

водстве[115], якая і стала ядром велізарнай латыфундыі з цэнтрам у Ружанах. Менавіта сярод гэтых маёнткаў і знаходзілася Бяроза.

Казімір Леў быў вядомы па сваіх шматлікіх фундушах на карысць каталіцкіх касцёлаў (Сямянічы, Дзятлава, Ружаны, Наваградак, Горкі, Бешанковічы, Бярэсце) і кляштараў (Бярэсце, Сапежын, Наваградак, Слонім), а таксама больш як 20 уніяцкіх цэрваў[116]. 63 тыс. талераў выдаткаваў ён на срэбную раку Язафата Кунцэвіча. Вядомай была яго\u043dая капэла і выдатная бібліятэка ў Ружанах (каля 3 тыс. тамоў), перададзеная ім Віленскай акадэміі – так званая Bibliotheca Sapiehana, перанесеная ў Вільню ў 1666 г. Для той жа акадэміі Сапега фундаваў у 1641 г. кафедры кананічнага і цывільнага права. Казіміра Льва шанавалі як адданага абаронцу Каталіцкага Касцёлу. Разам з тым гісторыкі не прызнаюць за ім выдатных здольнасцяў палітычнага дзеяча і хутчэй адмаўляюць тое, што ён адыгрываў значную ролю ва ўнутранай ці знешняй палітыцы. Але ж Казімір Леў лічыўся добрым прамоўцам, а ягоная «Oratio ad Reipublicae Poloniae senators» (1649) была вельмі папулярнай сярод шляхты. Набожнасць, як лічыцца, стала асноўнай прычынай заспавання Сапегам кляштара картузаў[117].

Не да канца ясным застаецца пытанне, чаму падканцлер ВКЛ запрасіў ассеці на прыналежных яму землях менавіта картузаў. Даследчыкі гісторыі картузій у Рэчы Паспалітай ужо выказвалі меркаванні, што Казімір Леў мог пазнаёміцца з картузамі падчас сваіх падарожжаў па Еўропе – той час Ордэн перажываў новы ўздым у перыяд пасля Рэфармацыі[118]. Вядома, такую магчымасць не варта адкідаць, але ж першы дакумент на тэматыцы фундацыі кляштара, які фіксуецца, – гэта ліст канвенту Гданьскай Картузіі 1646 г. да падканцлера ВКЛ, у якіх манахі апісвалі найслыннней-

[115] *Rachuba A.* Sapicha Kazimierz Leon. S. 35.

[116] Гл. таксама: *Kalnin W.* Architektura Białorusi w świetle mecenatu Radziwiłłów i Sapiehów // Przegląd Wschodni. T. VI. Z. 3(27). S. 648.

[117] *Dangel St.* Rok 1831 w Mińszczyźnie. Warszawa, 1925. T. II. S. 162.

[118] *Popowska M.* Rys dziejów kartuzji bereskiej w latach 1648–1831 // Ateneum Wileńskie. R. 13 (1938). Z. 1. S. 53; *Czaplewski P.* Kartuzja kaszubska. Gdańsk, 1966. S. 39–41.

шыя фундушы, што атрымліваў іхны Ордэн[119]. У гэтым лісце маецца важная фраза, якая сведчыць, што да праекта запрашэння картузаў ва ўладанні Казіміра Льва Сапегі непасрэднае дачыненне меў Эмануль Бжастоўскі, слонімскі земскі пісар, «qui sapientissime consuluii Fundatori, ut Cartusianos in his locis… fundaret»[120]. Рафал Віткоўскі мяркуе, што гэты ліст картузаў стаў адказам на зварот падканцлера[121]. Ліставанне паміж Казімірам Львом Сапегам, кіраўніцтвам Ордэна і Гданьскай Картузіяй, якое доўжылася тры гады, закончылася выпрацоўкай усіх фармальнасцяў і матэрыялізацыяй фундацыі. У чэрвені 1648 г. закладны камень новага кляштара быў накладзены папскім нунцыем Янам дэ Тарэсам у прысутнасці многіх прадстаўнікоў роду Сапегаў. Казімір Леў выдаткаваў 10 000 злотых на набудову святыні і, для пачатку, 6 келляў. Сапега перадаў новаму кляштару шэраг сваіх уладанняў: само мястэчка Бяроза з навакольнымі ўладаннямі; апроч таго, картузы атрымалі дзве вёскі ў Слонімскім павеце – Мілейкі і Замасцянка, мястэчка Бусяж. Гэтыя наданні былі зацверджаныя на генеральным Варшаўскім сойме ў 1653 г. Мяркуецца, што такі фундуш быў адным з самых значных у Вялікім Княстве Літоўскім на той час[122]. Фундатар перадаў таксама кніжкі для бібліятэкі кляштара.

У адрозненне ад большасці каталіцкіх кляштараў, што будаваліся ў гарадах, кляштар картузаў у Бярозе быў заснаваны ў мясцовасці з містычнай аўрай – тут некалі адбылося цудоўнае з'яўленне драўлянага крыжа з выявай распятага Хрыста. У выніку, Картузія ў Бярозе атрымала адпаведную назву – «Sanctae Crucis».

Сам фундатар не дачакаўся заканчэння будоўлі кляштара, бо 19 студзеня 1656 г. у ноч а першай гадзіне памёр у Брэсце. Але

---

[119] *Schwengel G.* Propago Sacri Cartusiensis per Germanium pars I. Appendix / ed. W Brauer, J. Hogga // Analecta Cartusiana. Salzburg, 1981. T. 90:3. P. 167–169, 173–174.

[120] *Idem.* Appendix. P. 173.

[121] *Witkowski R.* Pierwsze lata kartuzji Sanctae Crucis w Berezie // Litwa i jej sąsiedzi od XII do XX wieku. Poznań, 1994. S. 142.

[122] *Мараш Я. Н.* Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795). Минск, 1971. С. 141.

і ў тэстаменце адпісаў значныя сродкі на Бярозаўскую Картузію. Кансэкрацыя касцёла адбылася 6 чэрвеня 1666 г. і яе праводзіў крэўны фундатара жамойцкі біскуп Аляксандр Сапега. Нарэшце парэшткі Казіміра Льва былі пахаваныя ў Картузіі, у нішы ў паўднёвай сцяне храма, як тое завяшчаў фундатар[123]. Для Сапегаў з чарэйска-ружанскай лініі кляштар у Бярозе стаў родавым некропалем[124]. У 1757 г. пахаванне Казіміра Льва Сапегі было ўскрытае, а ў 1764 г. парэшткі падканцлера былі перапахаваныя ў новай труне (як можна зразумець з тэксту дакумента 1868 г., тут меўся на ўвазе знешні саркафаг)[125].

У зачыненым пасля паўстання 1830–1831 гг. кляштары яшчэ працягваў дзейнічаць касцёл – як парафіяльны. Але 24.08.1866 віленскі генерал-губернатар Канстанцін фон Каўфман паведамляў міністру ўнутраных спраў пра рашэнне разабраць касцёл[126]. У кастрычніку 1868 г. урна з сэрцам Казіміра Льва Сапегі была знойдзена ў сценах касцёла падчас яго разбурэння, якім кіраваў надворны саветнік Козыраў[127]. Паводле ўспамінаў Рамуальда Траўгута, з крыпты касцёла былі таксама вынятыя металёвыя труны Сапегаў «у вельмі добрым стане і з надпісамі» ды перапахаваныя «на мясцовых могілках непадалёку касцёла»[128]. Але ў кастрычніку 1869 г. пахаванні Сапегаў былі ўскрытыя вандаламі-скарбашукальнікамі, што стала нагодай для паліцэйскага следства, зрэшты, безвыніковага[129]. На могілках адбылося паўторнае пахаванне Сапегаў[130].

---

[123] *Dołżański L.* Dawny klasztor kartuzów w Berezie // Tygodnik Illustrowany. 1861, Nr 99, 5–17 sierpnia. S. 65.

[124] *Witkowski R.* Saeculum Cartusiae Berezanae. S. 174.

[125] НГАБ у Гродна. Ф. 1. Воп. 6. Спр. 1937. Арк. 49; *Синкевич Н.* Судьба погребения Казимира Леона Сапеги // Гістарычная брама. 2008. № 1. С. 50-51.

[126] РГИА. Ф. 821. Оп. 125. Д. 2801. Л. 44-45; *Кнырэвіч С.* Як адны разбуралі кляштар, а другія спрабавалі яго ратаваць // Гістарычная брама. 2008. № 1. С. 47.

[127] НГАБ у Гродна. Ф. 1. Воп. 6. Спр. 1937. Арк. 46–47; *Синкевич Н.* Судьба погребения Казимира Леона Сапеги. С. 51.

[128] *Traugutt.* Dokumenty. Listy. Wspomnienia / zeb. i oprac. ks. J. Jarzkbowski. Londyn, 1970. S. 49.

[129] НГАБ у Гродна. Ф. 1. Воп. 6. Спр. 1937. Арк. 98; *Синкевич Н.* Судьба погребения Казимира Леона Сапеги. С. 52.

[130] *Traugutt.* Dokumenty. Listy. Wspomnienia. S. 50.

Нічога невядома пра пазнейшы перанос гэтых пахаванняў у іншае месца. На мясцовых жа могілках, якія знаходзяцца побач з кляштарам, узвышаецца пірамідальная стэла, якая паводле меркаванняў мясцовых жыхароў і з'яўляецца надмагільным абеліскам пахаванняў Сапегаў[131]. Паводле знешніх параметраў, гэтая стэла выкладзена з цэглы, узятай з будынкаў кляштара. Калі гэта сапраўды месца пахавання Сапегаў, то Бяроза мае адзіны некрапаль гэтага роду на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

## Архітэктурная структура і адметнасць Бярозаўскага кляштара[132]

Гісторыя і вонкавае аблічча кляштара ў Бярозе прываблівалі даследчыкаў і мастакоў ужо ў XIX ст. Найбольш вядомай з'яўляецца класічная гравюра Бярозаўскай картузіі паводле малюнка Напалеона Орды[133] (гл. вокладку). Для сваёй творчасці Н. Орда выбраў тэхніку алоўкавага малюнка, надмаляванага акварэллю, гуашшу ці сепіяй, якой дасканала валодаў. Менавіта гэтая

[131] *Спикевич* // Судьба погребения Казимира Леона Сапеги. С. 54.

[132] За сваю амаль двухсотгадовую гісторыю кляштар пакінуў даволі значную колькасць дакументаў, якія былі прадметам аналізу гісторыкаў: *Witkowski R.* Pierwsze lata kartuzji Sanctae Crucis w Berezie; *Idem.* Szkice z dziejów Kartuzji Bereskiej 1648–1831 // Lituano-Slavica Poznanensia. Studia Historica. T. VII. Poznań, 1997. S. 73–118; *Idem.* Saeculum Cartusiae Berezanae // Ibid. S. 173–244; Akt wizytacji Kartuzji Berkiej z roku 1830 / Do druku przygotował i wstępem opatrzył Rafał Witkowski // Lituano-Slavica Poznanensia. Studia Historica. T. IX. Poznań, 2003. S. 331–400; *Idem.* Bereza / Bjaroza // Monasticon Cartusiense. Bd. 2. (Analecta Cartusiana. Bd. 185/2. Hrsg. von G. Schlegel, J. Hogg). Salzburg, 2004. S. 142–148; Таксама апублікавана праца па гісторыі бібліятэкі кляштара: *Nierzwicki K.* Die Klosterbibliothek der Kartause «Sanctae Crucis» in Bereza Kartuska / überzetzt von Olga Jachowicz // Analecta Cartusiana. Bd. 198. Salzburg, 2004; Рэцэнзія Рафала Віткоўскага: Lituano-Slavica Poznanensia. Studia Historica. T. XI. Poznań, 2005. S. 285–288.

[133] Album widoków historycznych Polski poswięcony rodakom. Zrysowany z natury przez Napoleona Ordy. Warszawa, 1875. Ser. I. Nr 7. З апошніх публікацый: Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX ст. / укл. А. М. Кулагін, У. А. Герасімовіч. Мінск, 2001. № 14. С. 27; Напалеон Орда. З фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі / укл. В. К. Чаронка, У. А. Герасімовіч. Мінск, 2006. С. 24.

тэхніка малявання ва ўмовах падарожжа дазваляла апаратыўна і найбольш дакладна адлюстроўваць натурны архітэктурны краявід. Мастак абраў адзіны фармат паперы (даўжыня каля 30 см), наклеенай на планшэтку[134]. Гравюры на камені з малюнкаў Орды зрабіў Алаіз Місуровіч на літаграфічным камбінаце Максімільяна Фаянса ў Варшаве. Менавіта ў выглядзе гравюр малюнкі Орды сталі шырока вядомымі і папулярнымі. На Гродзенскай ж губерні, у склад якой тады ўваходзіла Бяроза, мастак рэгулярна вандраваў на працягу 1860–1877 гг., гэта значыць, ужо пасля закрыцця кляштара расійскімі ўладамі. Але паводле малюнкаў комплекс кляштара з касцёлам выглядаў на той час яшчэ дастаткова маляўніча і прывабна. Подпісы пад апублікаванымі малюнкамі на польскай і французскай мовах Орда рабіў сам. Напэўна тэхнічнай памылкай друку з'яўляецца датаванне заладжэння кляштара пад гравюрай Бярозаўскай картузіі 1618 г. («Klasztor Kartuzów założony r. 1618 przez X. Lwa Sapiehę w pięknej i bogatej okolicy nad rzeką Jasiołdą, roku 1706 zdobywany przez Karola XII króla Szwedzkiego») – мусіў быць 1648 год. Таксама памылкова фундатарам кляштара тут названы Леў Сапега, а не яго сын Казімір Леў[135].

Яшчэ адна досыць вядомая гравюра Бярозаўскай картузіі была выканана Браніславам Падбельскім, вядомым сваімі працай для варшаўскага «Tygodnika Illustrowanego»: «Dawny klasztor kartuzów w Berezie (Rysował Podbielski, podług szkicu z miejśca nadesłanego)»[136]. Сітуацыйна гэтыя дзве гравюры паказваюць падобную сітуацыі – частку кляштарнага комплексу з касцёлам і галоўнай брамаю. Таксама і першыя гістарычныя апісанні кляштара пачалі з'яўляцца з сярэдзіны XIX ст., калі манахаў тут ужо не было.

---

[134] *Кулагін А.* М. Талент, аддадзены Радзіме // Беларусь у малюнках Напалеона Орды. С. 7.

[135] Адзначым тут недастатковую навуковую рэдактуру апошняга беларускага выдання альбома гравюр, бо вышэйпрыведзены тэкст быў тут перакладзены на беларускую і англійскую мовы наўпрост, без каментарыяў і ўдакладненняў: Напалеон Орда. З фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. С. 24.

[136] *Dołżański L.* Dawny klasztor kartuzów w Berezie // Tygodnik Illustrowany. 1861. Nr 99, 5–17 sierpnia. S. 65.



pawet.net

Найбольш жа дакладнае ўяўленне пра архітэктуру комплексу па стане на першую трэць XIX ст. даюць абмерныя чарцяжы 1830-х г., якія захоўваюцца ў Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве ў Маскве[137]. Ліквідацыя кляштара пасля паўстання 1830–1831 гг. і размяшчэнне на ягонай тэрыторыі расійскага вайсковага гарнізону сталі нагодай да з'яўлення гэтых чарцяжоў, выкананых на даволі высокім узроўні (гл. уклейку, мал. 2–5)[138].

Цэнтрам планіровачнай і аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі ўсяго комплексу была трохнефавая базіліка касцёла з бязвежавым фасадам, злёгку раскрапаваным плоскім рызалітам (частка будынка, якая выступае за лінію фасада на ўсю яго вышыню). Дакладна пасярэдзіне касцёл падзяляўся на дзве часткі: уваходную – з нефамі, злучанымі міжнефавымі аркадамі (для звычайных парафіян), і алтарную – з моцна выцягнутым прэсбітэрыем (прасторa перад галоўным алтаром), да якога далучалася васьміграння вежа-званіца. Абапал прэсбітэрыя размяшчаліся аддзеленыя ад яго муравaнымі сценамі вузкія капліцы, завершаныя з усходу невялікімі гранёнымі апсідамі. Алтарная частка прызначалася менавіта для манахаў-самотнікаў. Функцыянальны падзел храма на асобныя часткі ажыццяўляўся пры дапамозе паняровчнай галерэі, якая акрэслівала мяжу паміж манаскай і свецкай часткамі комплексу, да галоўнай апсіды, унутры двара эрэмаў манахаў-самотнікаў, далучалася шмат'ярусная вежа-званіца, якая выконвала ролю акцэнтацыі кампазіцыйнага цэнтра ансамбля, набудаванага ў эстэтычнай канцэпцыі сталага барока. Галерэя з абодвух бакоў касцёла пераходзіла ў шырокі светлы калідор, які ўтвараў замкнёны, блізкі да квадрата ўнутраны двор кляштара на ўсход ад касцёла. Ад асноўнага

[137] Российский государственный военно-исторический архив (далее РГВИА). Ф. 349. Оп. 17. Д. 1591–1594. Гл. : *Квитницкая Е. Д.* Архитектура Белоруссии XIV–XVIII вв. // Всеобщая история архитектуры. М., 1968. Т. 6. С. 494. Ил. 28; *Яе ж.* Кляштар у Картузскай Бярозе // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1973. № 4. С. 19–23.

[138] Ілюстрацыі былі прадстаўлены Д. Пірамідовіч з кнігі: *Piramidowicz, D.* Feniks świata litewskiego. Fundacje i inicjatywy artystyczne Kazimierza Leona Sapiehy (1609–1656). Warszawa, 2012. S. 103–107.

калідора перпендыкулярна адыходзілі кароткія калідоры, якія злучалі малыя комплексы з трох пакояў і невялічкім агародзе пры іх, – гэта і былі манаскія эрэмы (келлі). Кожны мінікомплекс эрэма быў абнесены ў сваю чаргу таксама мураванай сцяной – такім чынам, жытло манахаў-самотнікаў было ізаляванае ад навакольнага свету.

Але апроч гэтай зачыненай часткі кляштарнага комплексу, існавала больш адкрытая для парафіянаў частка, што знаходзілася адразу за галоўнай брамай, на поўнач ад касцёла. Гэтая частка комплексу, паводле сведчанняў сярэдзіны XIX ст., называлася Гасціннай, бо падарожнікі знаходзілі там начлег і харчаванне[139]. Менавіта тут размяшчаўся двухпавярховы палац Сапегаў (мал. 1). У гэтай частцы комплексу знаходзіліся таксама аптэка і гаспадарчыя карпусы кляштара. Будаўніцтва асноўных будынкаў ансамбля было завершанае да 1689 г., пра што сведчыла дата на франтоне галоўнай брамы. У больш позні час былі ўзведзеныя яшчэ некалькі службовых будынкаў уздоўж паўночнай сцяны кляштара, а з поўдня і ўсходу ад яго створаны пладовы сад з сажалкай. Увесь комплекс быў дадаткова абнесены мураванай сцяной з невялічкімі вежамі і ровам. Агульная плошча комплексу перавышала 1,5 га.

У паўднёвай сакрыстыі касцёла знаходзіўся ўваход у крыпту, у якой знаходзіліся пахаванні заможных жыхароў Бярозы і ваколіц, у тым ліку 15 прадстаўнікоў роду Сапегаў. Могілкі для законнікаў размяшчаліся ўнутры кляштарнага двара.

Ансамбль кляштара вызначаўся надзвычайным адзінствам архітэктурнай задумы і дасканаласцю яе ўвасаблення, арыгінальнасцю і самабытнасцю аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі, што было абумоўлена спалучэннем спецыфікі ордэнскага статуту картузаў, формаў італьянскага барока ды мясцовых будаўнічых традыцый[140].

---

[139] *T. K.* O kartuzach w Berezie // Tygodnik ilustrowany. Nr. 105. 1861. 16–28 września. S. 119–120.

[140] *Габрусь Т.* Па надзвычай строгаму статуту // Мастацтва. 1994. № 11. С. 59 62; [*Габрусь Тамара*]. Па надзвычай строгаму статуту // Страчаная спадчына / уклад. Т. В. Габрусь. Мінск, 1998. С. 133-138; *Габрусь Т. В.*



Мал. 1. Будынкі на тэрыторыі Гасціннай часткі кляштара. Злева – былы палац Сапегаў, справа – капліца, пабудаваная ў 1905–1907 гг. 1-я палова XX ст. Публікуецца ўпершыню



Мал. 1а. Будынкі на тэрыторыі Гасціннай часткі кляштара. У цэнтры – былы палац Сапегаў, справа – капліца, пабудаваная ў 1905–1907 гг. 1-я палова XX ст.

Трэба сказаць, што кляштар у Бярозе не накідае ў спакоі беларускіх аўтараў, разнастайныя матэрыялы даведачна-энцыклапедычнага[141] і публіцыстычнага[142] характару пра мінулае і сучасны стан помніка працягваюць з'яўляцца, прыцягваючы ўвагу публікі.

---

Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мінск, 2001. С. 123–125; *Яе ж.* Муравазая сакральная архітэктура XVI–XVIII стст. // Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т. Мінск, 2006. Т. 2: XV – сярэдзіна XVIII ст. С. 218–220. Гл. таксама літаратуру, прысвечаную архітэктуры комплексу: *Miłobędzki A.* Architektura polska XVII wieku. Teksty. Warszawa, 1980. S. 283–286; *Дзярновіч А., Калнін В.* Гісторыка-археалагічныя даследаванні Бярозаўскага кляштару картузаў // З глыбі вякоў. Наш край: Гісторыка-культуралагічны зборнік. Мінск, 1992. С. 120–149; *Слюнькова И. Н.* Монастыри восточной и западной традиции. Наследие архитектуры Беларуси. М., 2002. С. 180–183, 538–539.

[141] *Чантурыя У. А.* Кляштар картузіянцаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. Мінск, 1984. С. 117–118; *Ярашэвіч А. А.* Бярозаўскі кляштар картузіянцаў // ЭГБ. Мінск, 1994. Т. 2. С. 171; Бярозаўскі касцёл і кляштар картузіянцаў // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Мінск, 1996. Т. 2. С. 411; *Кулагін А. М.* Каталіцкія храмы на Беларусі: энцыкл. давед. Мінск, 2000 (2-е выд.: 2001). С. 167–168, 206; *Ярашэвіч А. А.* Бярозаўскі кляштар картузіянцаў // Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. Мінск, 2001. С. 60; *Ярашэвіч А. А.* Бярозаўскі кляштар картузіянцаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл: у 2 т. Мінск, 2005. Т. 1. С. 364–365.

[142] *Селеня Е. В., Сикорин Н. Д.* Береза: Ист.-экон. очерк. Минск, 1977; *Селеня Е. В.* Береза: ист.-экон. очерк. Минск, 1988. С. 4–5; *Дзярновіч А.* Маўклівы кляштар князя Сапегі // Наша ніва. 1991. № 3 (перадрук: Гістарычная брама (Брэст). № 1. 1997 (у Інтэрнэце: http://brama.brest.by/nomer1/artic03.shtml; http://w3.bresttelecom.by/~brama/nomer1/artic03.shtml); Маўклівы кляштар Сапегі // Найясьнейшая Рэч Паспалітая: Цывілізацыя–Культура–Рэлігія–Палітыка–Авантура–Героіка Успамін. Мінск, 2007. С. 92–98); *Мартинович В.* «Мертвый город» может спать спокойно – за двести лет о березовском монастыре забыли и местные жители, и историки, и археологи // Белорусская Деловая Газета. № 766. 13.05.2000; Орден картезианцев // История орденов средневековья / авт.-сост. И. Е. Гусев. Минск, 2007. С. 93–108 (гэтая публікацыя поўніцца памылкамі). Рэгулярныя фотарэпартажы ў газеце «Наша Ніва»: http://www.nn.by/index.php?c=ar&i=13999; http://www.nn.by/index.php?c=ar&i=18735

## Археалагічнае даследаванне Бярозаўскай картузіі

Нягледзячы на ўсю архітэктурную значнасць кляштара картузаў у Бярозе археалагічныя даследаванні тэрыторыі помніка ўпершыню праводзіліся толькі ў 1989–1990 гг. Хоць ускрытая была даволі значная плошча – 3 раскопы (агульная плошча 425 м²) і 24 шурфы (агульная плошча 102 м²) (мал. 2; мал. 5). Даследаванні праводзіліся экспедыцый тагачаснага інстытута «Белспецпраектрэстаўрацыя»[143]. У той час на зломе эпох рабіліся намаганні, каб правесці кансервацыю ацалелых будынкаў кляштара і непасрэднаю мэтаю археалагічных раскопак было ўдакладненне архітэктурнай гісторыі комплексу, а таксама вывучэнне культурнага слою на тэрыторыі помніка. Такім чынам, ускрываліся падмуркі незахаваных пабудоваў, а таксама даследаваліся падмуркі і падземныя канструкцыі тых будынкаў, што існуюць дагэтуль[144].

### *Агульная стратыграфія*

У тых месцах, дзе няма перакопаў, стратыграфічная сітуацыя выглядае наступным чынам:

1. Зверху знаходзіцца пласт гумусу таўшчынёй 0,1 м.

2. Ніжэй залягае шэры альбо светла-шэры пласт сярэдзіны XIX – XX ст., таўшчынёй 0,4–0,6 м. Будаўнічы друз гэтага пласту – след разбурэння кляштара.

3. Яшчэ ніжэй знаходзіцца цёмна-шэры альбо шэры пласт таўшчынёй да 1 м, які датуецца канцом XVII – пачаткам

---

[143] Архіў Інстытута «Белспецпраектрэстаўрацыя». Аб'ект 406–89. Інв. № 3–6 (*Дзярновіч А.* Справаздачы аб архітэктурна-археалагічных даследаваннях помніка архітэктуры XVII ст. – кляштара картузіянцаў у г. Бяроза Брэсцкай вобласці ў 1989–1990 гг.).

[144] Папярэднія вынікі даследавання гэтага этапу былі апублікаваныя: *Дзярновіч А.*, *Калнін В.* Гісторыка-археалагічныя даследаванні Бярозаўскага кляштару картузаў. С. 137–149; *Дзярновіч А.* Бярозаўскі кляштар картузіянцаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. Мінск, 1993. С. 109; *Ляўко В. М.* Манастырскія комплексы // Археалогія Беларусі: у 4 т. Мінск., 2001. Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. С. 116, 225–226, мал. 119–120; таксама ў гэтым выданні: С. 9, 351, 425 (мал. 194), 442 (мал. 216: 8), 567.




Мал. 2. План размяшчэння раскопаў і шурфа. Даследаванні 1989–1990 гг.

XIX ст. – перыядам паўнацэннага існавання кляштара. У гэтым пласце была сабраная найбольшая колькасць знаходак. Тут прысутнічаюць сляды як разбурэнняў, так і адбудоваў кляштара: праслойкі вугалля, будаўнічы друз (фрагменты цэглы, дахоўкі, ванны), светлага пяску.

4. Далей знаходзіцца чорны альбо цёмна-шэры пясок, магутнасць пласта якога дасягае 0,2–0,4 м. Практычна, гэта пласт засыпанай глебы, на якой распачалося будаўніцтва кляштара; яго можна трактаваць як будаўнічы гарызонт. Прысутнічае будаўнічае смецце – фрагменты цэглы, нязначная колькасць ванны.

Асобна вылучаецца шэрая праслойка часоў будаўніцтва. Яна мае ўжо значную вільготнасць, некалькі разоў на яе ўзроўні адбывалася завадненне шурфаў – вада прасочвалася з мацерыковай пароды.

5. Мацярык – шэры суглінак, радзей гліна альбо светлы пясок. Гэта алювіяльныя адкладанні. Увогуле Бяроза знаходзіцца ў Піна-Мухавецкім раёне Палескай ландшафтнай правінцыі, для якой характэрныя нізінныя алювіяльныя тэрасаваныя ландшафты[145]. Алювіяльныя адкладанні ўтвараюцца ў рэчышчах водных патокаў, складаюць поймы і тэрасы рачных далін і сустракаюцца ў пахаваным стане. Што важна – спецыфіка гэтых парод паўплывала на тэхналогію будаўніцтва кляштара.

## *Канструкцыя падмуркаў*

Заляганне трывалых парод заўважна ніжэй тагачасных гумусавых слаёў, а таксама значная вільготнасць мацерыковага грунту прывялі да ўтварэння своасаблівай тэхнікі выкладання падмуркаў кляштара. На мал. 3: 1 адлюстравана схема тыповага для Бярозаўскага кляштара картузаў у XVII–XVIII ст. падмурка.

Зверху знаходзіцца цагляная муроўка; пад ёй залягае муроўка з камянёў, якая часта гарызантальна выступае над «заліўкай»; ніжэй знаходзіцца ўласна «заліўка». Апошняя ўтваралася наступным чынам – выкапаны ў мацерыку роў літаральна заліваўся вапнавай рошчынай, ужо ў якую кідалі камяні. Такі прыём прывёў да таго, што ў стратыграфіі будаўнічы роў не вызначаецца, а лінія мацерыка вызначаецца вышэй, чым лінія падэшвы падмурка. Магутны слой вапны захоўваў ад намакання асноўны будаўнічы матэрыял – цэглу. Бо ва ўмовах сталага кантакту вады з кіслародам адбываецца досыць хуткая дэструкцыя цэглы. «Каменная» праслойка ўмацоўвала падмурак, на які ціснула маса гмаху. У месцах кантактаў падмуркаў розных збудаванняў, падмуркі дадаткова ўмацоўваліся рошчынай. Звяртае на сябе ўвагу шырокае выкарыстанне ў падмурках камянёў (валуноў да 0,6–0,8 м у папярочніку).

У будынку палаца Сапегаў ды іншых збудаванняў XVII ст. на ўзроўні дзённай наверхні мур звонку абкладзены цэглай (27,5–

[145] Ландшафты Белоруссии / под ред. Г. И. Марцинкевича, Н. К. Клициновой. Минск, 1989. С. 179–187.

28 × 14,5–15 × 8 см), якая выкарыстана па тыпу пліткі – пляскатай паверхняй звонку. Гэтак было зроблена з мэтаю захавання муроўкі будынка ад знешніх уздзеянняў у месцах кантакту з глебай.

### *Дзядзінец кляштара*

Трэба адзначыць, што на вядомых абмерных чарцяжах кляштара, зробленых каля 1835 г.[146], адзначаныя не ўсе будынкі, рэшткі якіх былі выяўлены падчас раскопак.

Шурфам № 10 (у двары, правей брамы – паводле плана) быў ускрыты падмурак невядомага будынку. Падмурак выкладзены з камянёў, замацаваных вапнавай рошчынай. Папярэдне ён датуецца другой паловай XVII – пачаткам XVIII ст.

Ва ўсходняй частцы раскопа № 1, якім ускрываўся «Дом рамесніка», адразу з правага ад брамы боку, па-за межамі будынка выяўленыя рэшткі лёхаў XVII ст., што былі знішчаныя ў XVIII ст., магчыма, падчас Паўночнай вайны. Усе гэтыя звесткі ўзбагачаюць і ўскладняюць архітэктурную гісторыю кляштара.

Унутры дзядзінца знойдзеныя рэшткі каменнай брукоўкі XVIII ст. Напэўна, двор захоўваўся ў добрым санітарным стане і рэгулярна прыбіраўся: на брукоўцы практычна няма знаходак.

### *Будаўніча-архітэктурныя асаблівасці пабудоваў і матэрыялы*

У будынках XVII – першай паловы XVIII ст. падлога накрывалася квадратнымі керамічнымі пліткамі (параметры: 21–21,2 × 21–21,2 × 5–5,5 см). Гэтыя пліткі былі выяўленыя, у тым ліку, у ацалелай вежы, якая знаходзіцца злева (на захад) ад брамы (шурф № 14; мал. 3: 2; мал. 4). Падобныя пліткі падлогі вядомыя ў Беларусі з XVI ст., вельмі блізкія аналагі выяўлены пры раскопках наваградскай Барыса-Глебскай царквы (паліваная плітка пачатку XVII ст., раскопкі М. Каргера) і магілёўскага Мікольскага манастыра (паліваная плітка другой паловы XVII ст.), падобныя квадратныя непаліваныя пліткі знойдзеныя

[146] РГВИА. Ф. 349. Оп. 17. Д. 1591–1594; *Квітніцкая А. Д.* Кляштар у Картузскай Бярозе // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1973. № 4. С. 20.




Мал. 3. Замалёўка профілю і падмурка. Падлога ў вежы. Печка



Мал. 4. Падлога ў вежы. Плітка XVII ст.



Мал. 5. Шурф каля галоўнага фасаду касцёла

падчас даследаванняў Мірскага замка (канец XVI–XVII ст.) і мінскага дамініканскага касцёла (XVII ст.)[147]. У вежы кляштара картузаў падлога на першым паверсе ў некалькіх месцах была пашкоджаная, а ў цэнтры наўмысна ў падлозе зроблена адтуліна дыяметрам прыкладна 0,75 м. Верагодна, у XVIII ст. вежа была пашкоджана і, каб зрабіць новыя перакрыцці паміж паверхамі, прыйшлося умацаваць драўляны слуп, які і ўтварыў адтуліну ў падлозе вежы.

У паўднёва-заходнім куце гэтай жа вежы знойдзены рэшткі печы. Яна была вымураваная ўжо на пліткавай падлозе XVII ст. (мал. 5:3), прычым з цаглін, якія ўжо былі ў карыстанні – бакі цаглін адбітыя. Цэгла, якая датуецца XVIII ст., мае памеры 31,5–33 × 15,5–16 × 6–6,5 см, колер – ярка-чырвоны. На сцяне, перад якой знаходзілася печ, маюцца сляды нішы з арачным завяршэннем. Падчас узвядзення печы нішу заклалі разнастайнымі будаўнічымі матэрыяламі (у тым ліку і пліткай падлогі). Скляпенне печы, напэўна, супадала з узроўнем аркі былой нішы.

Характэрнай рысай ацяпляльнай сістэмы кляштара з'яўляліся цеплавыя каналы. Такі канал, у прыватнасці, выяўлены ў палацы Сапегаў. Ён пачынаўся ад каміну, ішоў над падлогай, у тым ліку і над подам яшчэ адной печы, атрымліваючы, такім чынам, дадатковае цяпло. У выніку цяпло ад печаў і каміна выкарыстоўвалася досыць рацыянальна.

Як ужо адзначалася, асноўны будаўнічы матэрыял – цэгла. Вылучаецца цэгла XVII ст., параметры якой 27–28 × 14,5 - 15 × 6–6,5 см, колер светла-карычневы, дамешкі з дробных каменьчыкаў, абпал раўнамерны. Найбольш блізкая па параметрах цэгла паводле апублікаванай інфармацыі з рэшткаў жылых карпусоў Брацкага манастыра ў Магілёве (сярэдзіна – другая палова XVII ст.): 26–27 × 15–16 × 6–6,5 см[148].

---

[147] *Трусаў А. А., Чарняўскі І. М.* Керамічныя падлогі ў інтэр'ерах помнікаў дойлідства беларускага сярэдневякоўя // Помнікі культуры: Новыя адкрыцці. Мінск, 1985. С. 192; *Трусаў А.* Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стагоддзяў: Гісторыя будаўнічай тэхнікі. Мінск, 2001. С. 36, 107.

[148] *Трусов О. А.* Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв.: Архитектурно-археологический анализ. Минск, 1988. С. 107.

Значна радзеі у другой палове XVII ст. выкарыстоўвалася цэгла памерамі 30–31 × 14–14,5 × 7,5–8 см. Паверхня цэглы роўная. У XVIII ст. такой цэглай выкладалася падлога ў памяшканнях кляштара.

Муроўка сцен кляштара – рэнесансавая крыжовая. Пры такім тыпе муроўкі рады цэглы выкладаліся наступным чынам: адзін цалкам з лажкоў (даўжэйшай часткі цэглы), другі – цалкам з тычкоў (найвузейшая частка), чарговы – зноў з лажкоў і г. д. Прычым лажок і верхні ды ніжні тычок камбінаваліся такім спосабам, што ў абрысах утваралі крыж[149]. Але ў бярозаўскім кляштары такая схема муроўкі строга не вытрымлівалася. Цэгла змацоўвалася ваннавай рошчынай. Шоў таўшчынёй 2–2,5 см.

Падчас раскопак была знойдзена таксама дахоўка – пляскатая і хвалістая. Першая датуецца XVII ст., адзін бок у яе скруглены. Таўшчыня дахоўкі ў сярэднім складае 2 см. Шып у разрэзе трапецаявідны, вышынёй 2,5–3 см (мал. 6). На ўнутранай, крыху ўвагнутай паверхні дахоўкі маюцца неглыбокія барозны. На знешняй паверхні бачны сляды ад фармовачнай рамкі. У раскопах і шурфах каля касцёла знойдзены нераважна экзэмпляры паліва, якія маюць насычаны зялёны колер. Можна меркаваць, што дах касцёла быў пакрыты паліванай дахоўкай. Гэтая дэталь аднаўляе для нас і мастацкі вобраз помніка – смарагдавы дах белага тынкаванага гмаху на фоне блакітнага палескага неба. І калі ставіць за мэту аднаўленне барочнай эстэтыкі кляштара, то падобную каляровую гаму трэба абавязкова ўлічваць. Але ж у XIX ст., як вядома, дах касцёла быў пакрыты меднымі бляхамі, якія паводле распараджэння гродзенскага губернатара ад 1866 г. выкарысталі для пакрыцця даху царквы Аляксандра Неўскага ў Гродне. Каля брамы, акрамя зялёнапаліванай, была знойдзеная таксама дахоўка, пакрытая светла-карычневай палівай. Магчыма, дах брамы быў пакрыты рознакаляровай дахоўкай, якая ўтварала арнамент.

---

[149] *Трусов О. А.* Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. С. 83.



Мал. 6. Фрагмент шляскатай дахоўкі з шыпом. Сяр. XVII ст.

Знойдзеная кафля датуецца сярэдзінай XVII – пачаткам XIX ст. – перыядам існавання кляштара. Адзін з улюблёных матываў бярозаўскай кафлі – раслінны. Ён выкарыстоўваўся на працягу XVII ст., а таксама на пачатку XVIII ст., калі знікае бакавая рамка (мал. 7: 3). Большасць кафлі XVII ст. з раслiннай арнаментацыяй зялёнапаліваная і толькі каля 30 % такой кафлі – тэракотавая. Быў знойдзены цэлы асобнік зялёнапаліванай кафлі (мал. 7: 6). У цэнтры арнаментальнага матыву досыць традыцыйны для беларускага кафлярства элемент – валошка. Але закампанавана яна ў рэнесансную рамку – пэўная архаічная рыса для мастацтва таго часу.

Цікавымі з'яўляюцца нешматлікія фрагменты геральдычнай кафлі. Геральдычны матыў звязаны з родам Сапегаў – заснавальнікаў кляштара. Іх герб «Ліс» з'яўляецца асноўным элементам дэкору тэракотавай кафлі сярэдзіны – другой паловы XVII ст. (мал. 7: 8). Фрагменты дробныя і цалкам дакладна аднавіць такую кафлю не падаецца магчымым. Але заўважна спецыфіка: герб «Ліс» – перакрыжаваная двюмя рысачкамі страла, мае своеасаблівы картуш, што акантоўвае рысачкі. Дзве лініі картуша сыходзяцца каля нізу дрэўка стралы. З Сапегамі, напэўна, звязаныя і манаграмы на зялёнапаліванай кафлі (мал. 8: 18).



Мал. 7. Кафля і керамічны посуд. XVII–XVIII стст.

На захаванай частцы паверхні кафлі выразна бачныя літары «S», «L», «В» – першыя дзве гіпатэтычна можна прыняць за пачатковыя літары словаў «Сапега» і «Літоўскі», што адпавядае сітуацыі. На гэтым жа фрагменце бачны і геральдычны картуш. Фрагмент кутняй зялёнапаліванай кафлі сярэдзіны XVII ст. з літарай «К» («Казімір» – ?) аздоблены выяваю крыла (арла?) (мал. 8: 19).




Мал. 8. Кафля і керамічны посуд. XVII–XVIII стст.

Нязвыклым можна назваць дэкор кафлі другой паловы XVIII ст. Кафля мае гладкую паверхню (мал. 7: 5), а яе пласціна пакрытая цёмна-жоўтай, светла-карычневай альбо салатавай палівай (мал. 9). Потым па гэтым фоне былі нанесены палосы ды плямы карычневага, зялёнага, салатавага колеру – своеасаблівы



pawet.net



Мал. 9. Пласцінчатая паліхромная кафля. II палова XVIII ст. (фонды Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея)

сюррэалізм XVIII ст., тым больш дзіўны, што гэта кафля з кляштара, дзе панаваў аскетычны лад жыцця. Менавіта такой кафляй былі аздоблены печы ў вежы, а таксама ў палацы. Падобную ж каляровую гаму мае і гзымсавая кафля таго ж часу (мал. 10)[150]. Сярэдзінай XVIII ст. датуюцца таксама гладкая кафля, пакрытая шчыльнай зялёнай палівай.

## *Керамічны посуд*

Увесь керамічны посуд бярозаўскай калекцыі паводле прынцыпаў тэхналагічнай апрацоўкі можна падзяліць на чорнадымлены (84 % знойдзеных фрагментаў), паліваны (10 %) і тэракотавы (6 %). Чорнадымлены посуд быў самым пашыраным на працягу XVII–XVIII ст. у бярозаўскім кляштары. Гэтым Бяроза рэзка адрозніваецца, да прыкладу, ад таксама

[150] Найбольш цікавыя асобнікі кафлі і керамічнага посуду былі рэстаўраваны мастаком-керамістам Марыяй Угрыновіч і перададзены ў фонды Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея (гл.: Архіў Інстытута «Белспецпраектрэстаўрацыя». Аб'ект 406-89. Інв. № 7. Альбом фотаздымкаў цэлых (рэстаўраваных) керамічных вырабаў).



Мал. 10. Паліхромны кафляны гзымс. II палова XVIII ст.
(фонды Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея)

паляескага Століна, дзе абсалютная большасць посуду выраблялася з тлустай белай гліны. Але бярозаўскі чорнадымлены посуд спецыфічны і на ўзроўні марфалагічным, а не толькі тэхналагічным. Прафіліроўка венцаў мае няшмат аналагаў у іншых гарадах і рэгіёнах Беларусі. Досыць шырокі асартымент чорнадымленага посуду, гаршчкі ж складаюць 50 % яго. У XVII ст. гаршчкі мелі амаль вертыкальную шыйку на пукатых плечуках (мал. 8: 4, 5), альбо крыху адхіленую ў вонкавы бок шыйку з патаўшчэннем у месцы пераходу шыйкі ў плечукі (мал. 8: 3). Найбольш распаўсюджаны дыяметр венцаў 13, 15, 19 см. Першы тып у нейкай ступені падобны да віцебскіх гаршчкоў тыпу А групы 2[151]. Бярозаўскія гаршчкі гэтага часу багата арнаментаваныя глянцаваннем.

У XVIII ст. профіль сценак гаршчкоў набывае S-падобную форму (мал. 8: 7), назіраецца і пераходны варыянт да традыцыйнай формы (Іл. 8: 6). Калі не ўлічваць завяршэнне вянца, то сваімі плаўнымі абрысамі гэты тып гаршчкоў нагадвае гаршчкі з Мірскага замка (тып I, II)[152]. З канца XVIII ст. ужы-

---

[151] *Левко О. Н.* Методика изучения позднесредневековой керамики Витебска // Древности Белоруссии и Литвы. Минск, 1982. С. 134–135.

[152] *Зданович Н. И.* Неполиваная посуда Мирского замка // Древности Литвы и Белоруссии. Вильнюс, 1988. С. 146, мал. 1.

ваюцца гаршчкі з адхіленай у вонкавы бок шыйкай, уверсе венца патоўшчанае. Дыяметры венцаў XVIII ст. у параўнанні з XVII ст. маюць тэндэнцыю да павелічэння (20–21 см). Глянцаванне выкарыстоўвалася і ў XVIII ст., але малюнак строга не вытрымліваўся, сістэма «сетачкі» парушалася. У XVII ст. меў распаўсюджанне чорнадымлены посуд пераходнай формы ад гаршчкоў да макотраў, калі адцягнутае венца набліжаецца да гарызантальнага (мал. 8: 2).

Макотры складаюць прыблізна 10 % чорнадымленага посуду. Калі ў XVII ст. адцягнутасць венца не такая значная, дык у XVIII ст. венцы прыкметна адцягваюцца ў вонкавы бок, патаўшчаюцца, а знутры маюць раўчук альбо зрэз (мал. 8: 1; мал. 11). Дыяметр венцаў макотраў у XVIII ст. павялічваецца з 22–28 да 31–32 см.

Прыблізна 20 % чорнадымленага посуду складаюць збаны. Іхная прафіліроўка ў XVIII ст. робіцца больш простай (мал. 8: 15), але венца можа набываць і вонкавы гзымсік (мал. 8: 14). Дыяметр венцаў збаноў досыць стабільны – 12 см.



Мал. 11. Чорнадымленая макотра. XVIII ст. (фонды Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея)

Даволі распаўсюджаныя сярод керамічнага матэрыялу былі місы – каля 20 % чорнадымленага посуду. Прафіліроўка іх досыць стандартная на працягу XVII–XVIII ст., але ў XVII ст. венца заканчвалася выразным патаўшчэннем альбо невялічкім адхіленнем у вонкавы бок (мал. 8: 9), што ў XVIII ст. згладжваецца (мал. 8: 10). Дыяметр венцаў вытрымліваецца ў параметрах 25–30 см, асобныя экзэмпляры дасягаюць 15 ды 35 см. Прычым павелічэнне варыятыўнасці назіраецца ў XVIII ст. У місах асабліва шырока выкарыстоўваўся глянцаваны арнамент. У асобных выпадках місы аздабляліся слядамі прыціскання пазногцяў на вонкавым баку (мал. 8: 16).

Да канца не высветлена прызначэнне фрагмента чорнадымленага вырабу з утулкай (мал. 8: 17). Выяўлены ён быў у слаях XVII ст. і, магчыма, быў злівам буйнога начыння. Варта адзначыць такі цікавы від посуду, як керамічныя чорнадымленыя друшлякі, фрагменты якіх знойдзены на тэрыторыі кляштара (мал. 8: 8, 11). У калекцыі маецца таксама фрагмент тэракотавага друшляка (мал. 8: 12), але ў параўнанні з чорнадымленымі сценкі яго заўважна таўсцейшыя і дасягаюць 2 см.

Увогуле ж тэракотавы посуд у Бярозе найбяднейшы па асартыменце і па колькасці (6 %). Тэракотавыя гаршчкі XVII ст. маюць невялікую прамую шыйку з вонкавым валікам. На працягу XVIII ст. абрысы венцаў спрашчаюцца, уверсе назіраецца патаўшчэнне.

Паліваны посуд складае 10 % ад усяго керамічнага посуду. Прафіліроўка венцаў гаршчкоў у XVII ст. больш складаная, чым у XVIII ст. Звычайна звонку яны маюць гзымсік. Дыяметры венцаў канцэнтруюцца ў дзвюх групах: 8–10 см і 15–23 см. У XVIII ст. венцы прамыя, злёгку патоўшчаныя. Найбольш распаўсюджаныя дыяметры 10 і 23 см. Донцы паліванага посуду маюць дыяметры 8–11 см, асобныя экземпляры – 6 і 16 см. У XVIII ст. шырока ўжываліся паліхромныя талеркі і місы з наступнай дэкаратыўнай сістэмай: бякла-ружовы фон, раслінны роспіс цёмна-зялёнымі і бэзавымі палівамі (мал. 7: 1; мал. 12). У калекцыі маюцца зялёнапаліваныя рынкі другой паловы XVII ст.; вылучаецца невялікая, дыяметрам 10 см («на адно



Мал. 12. Талерка. XVIII ст. (фонды Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея).



Мал. 13. Рынка. II палова XVIII ст.
(фонды Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея)

яйка») патэльня (мал. 7: 4; мал. 13). Пэўна, наяўнасць падобнага аднаасобнага посуду звязаная з кляштарным ладам жыцця, дзе яскрава прысутнічалі пустэльніцтва і адзінота. Бо посуд «на адну порцыю» быў знойдзены яшчэ дадаткова – гэта пакрыўкі дыяметрам 6 см і 7,2 см, гаршчок дыяметрам донца 5 см і венца 9 см (мал. 7: 2, 3; мал. 14).



Мал. 14. Керамічны посуд «на адну порцыю»: накрыўка і гарнічок. XVII ст. (фонды Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея)

## *Шкляны посуд*

Найбольшую цікавасць выклікае шкляніца, знойдзеная ў слаях XVIII ст. Непасрэдна знаходка зроблена ў раскопе 1, якім былі ўскрытыя падмуркі будынку паміж брамаю і касцёлам і вядомага паводле пісьмовых крыніц як «Дом рамесніка» (магчыма, таксама майстэрня). На ўсход ад будынка знойдзены два сутарэнні, перакрытыя скляпеннямі. Паводле канструкцыйных асаблівасцей і выкарыстанага матэрыялу, яны датуюцца другой паловай XVII ст. Бачна, што яны была пашкоджаныя, магчыма, падчас Паўночнай вайны. У пласце XVIII ст., што запаўняе сутарэнні, і была выяўлена шкляніца.

Шкляніца мае вышыню 118 мм, дыяметр венца 90 мм, донца – 65 мм. Таўшчыня шкла ўверсе каля 2 мм, у прыдоннай частцы дасягае 3,5 мм. Шкло бясколернае, шкляніца мае 8 граняў, аздобленых ручной гравіроўкай. На дзвюх суседніх гранях арнамент розны, але далей ён паўтараецца (мал. 15: 1; мал. 16; мал. 17). Архітэктоніка шкляніцы гарманічна вытанчаная. Лініі яе стромкія, рэльефна пазначаныя лёгкімі вальцаванымі гранямі. Вер-




Мал. 15. Шкляны посуд і металічныя вырабы




Мал. 16. Графічная рэканструкцыя шкляніцы XVIII ст. і пазначэнне месца яе знаходкі



Мал. 17. Шкляніца. XVIII ст. (фонды Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь)

тыкальная дамінанта формы крыху стрымліваецца важкім устойлівым донцам. Празрыстыя, поўныя паветра, сценкі імкліва раскрываюцца ля вусця, нібы зліваюцца з прасторай і ствараюць забыты, хоць і даўно знаёмы прыродны вобраз чашы. Дапаўняе кампазіцыю тонка гравіраваны дэкаратыўны пас. Само дэкаратыўнае поле шкляніцы падзеленае на 8 (па колькасці граняў) звязаных між сабой медальёнаў, малюнак якіх паўтараецца. На сутнасці, чаргуюцца два кампазіцыйных матывы: трылісцік спалучаецца з выявамі перлін і чатырохпялёсткавых кветак. Па краі вусця цягнецца прыгожы шлячок у выглядзе хвалістай лініі. Таксама хвалістая лінія, але з большым крокам, замыкае дэкаратыўнае поле каля донца. Вальцаваныя грані, супастаўленне празрыстых сценак і важкага донца, вертыкальных ліній формы і гарызантальных дэкору, пышнасць аздобы, утвораная дзякуючы ламаным увогнутым кампазіцыям, сімвалічнасць вобраза (выява трылісніка – сімвал Хрыста, чысціні абранай мэты; выява перліны – таксама сімвал чысціні, цнатлівасці поглядаў), сведчыць пра безумоўна барочны характар шкляніцы.

Датаваць жа шкляніцу можна, відаць, не раней як сярэдзінай XVIII ст. Добрая тэхнічная якасць шкла, даволі высокі ўзровень гравіраваных кампазіцый (паводле аналагаў), стылявыя асаблівасці дэкору апраўдваюць такое датаванне[153]. Яно, дарэчы, супадае і з датаваннем паводле стратыграфіі. Рысы, блізкія да згаданых, сустракаюцца ў шкляным посудзе сярэдзіны XVIII ст., выяўленым на Старым месце ў Варшаве і атрыбутаванага як правінцыйны сярэднянямецкі, магчыма, саксонскі тып[154].

Адкуль жа паходзіць знойдзеная ў Бярозе шкляніца? Падабенства дэкору бярозаўскай знаходкі і польскіх аналагаў дазваляе меркаваць, услед за С. Цэпеляй, што перад намі так-

[153] *Станкевіч А., Дзярновіч А.* Госця або пані? На слядах адной знаходкі // Мастацтва. 1991. № 12. С. 68.

[154] *Ciepiela S.* Szkło osiemnastowieczne starej Warszawy. Warszawa, 1977. S. 24–25. Foto 8; S. 36–37. Foto 24.

сама выраб правінцыйнай багемскай альбо саксонскай школы. Гэта між іншым пацвярджае і хімічны склад шкляніцы[155].

Застаецца высветліць, якім шляхам шкляніца магла трапіць у Беларусь. Рынак правінцыйных нямецкіх гутаў быў абмежаваны гэтаксама, як і беларускіх. У пэўнай меры, аднак, правінцыйнай сярэдненямецкай школай можна лічыць і першыя беларускія шкляныя мануфактуры Радзівілаў і Тызенгаўза, бо вядома, што да канца 50 – пачатку 60-х гадоў XVIII ст. у сваёй дзейнасці яны выкарыстоўвалі пераважна нямецкія (ці багемскія) узоры і тэхналогію[156]. Такім чынам, бярозаўская шкляніца магла быць зроблена на адной з гэтых мануфактур. Да такой высновы вядзе нас і незашліфаваны след ад понціі на донцы пасудзіны, што часцей вылучаюць як традыцыйную адметнасць беларускага шкларобства[157]. Апублікаваныя ўзоры ўрэцка-налібоцкага шкла, тым не менш, паказваюць, што наўпроставага падабенства паміж дэкаратыўнай сістэмай арнаментыкі гэтых узораў і бярозаўскай знаходкі няма, але відавочнае стылёвае адзінства шкляніцы і посуду, выяўленага Маяй Яніцкай у Дзяржаўным Эрмітажы (Санкт-Пецярбург), Нацыянальным музеі ў Варшаве і атрыбутаванага ёй як гродзенскі[158]. Калі атрыбутацыя не памылковая, то бярозаўскую шкляніцу таксама можна лічыць вырабам Гродзенскай шкляной мануфактуры[159]. Больш дакладным доказам мясцовага паходжання гэтага вырабу паслужыў бы параўнальны аналіз хімічнага складу бярозаўскай шкляніцы з хімічным складам шкла беларускіх мануфактур. Аднак такіх звестак мы, на жаль, не маем. Прыведзеная формула шкла (табл. 1–3) супадае з вядомай формулай багемскага шкла – яе маглі выкарыстоўваць і беларускія гутнікі.

---

[155] Хімічны аналіз быў зроблены ў лабараторыі Інстытута «Белспецпраектрэстаўрацыя» Ігарам Раханскім.

[156] *Яніцкая М. М.* Беларускае мастацкае шкло (XVI–XVIII ст.). Мінск, 1977. С. 39–41, 76–77; *Яе ж.* Гісторыя шкляной вясёлкі. Мінск, 1986. С. 59.

[157] *Яе ж.* Беларускае мастацкае шкло (XVI–XVIII ст.). С. 39–40.

[158] Тамсама. С. 76–77. Фота 88, 89, 92, 93; Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Мінск, 1988. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII ст. С. 318–319.

[159] *Сташкевіч А., Дзярновіч А.* Госця або пані? С. 68.

Знаходка такой каштоўнай рэчы ў кляштары робіцца зразумелай, калі ўлічыць, што тут існаваў палац Сапегаў[160]. Шкло на той час было дарагім таварам, асабліва шкло, па-мастацку аздобленае.

*Табліца 1.* **Хімічны склад шыхты шкла ў вагавых %**
**(паводле экспертзы І. Раханскага)**

| | Палутарныя вокісы і $TiO_2$ | | | | | | | Шчолачныя вокісы | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | $SiO_2$ | $Fe_2O_3$ | $Al_2O_3$ | $TiO_2$ | Сума | $CaO_2$ | MgO | MgO | $K_2O$ | $Na_2O$ | $P_2O_5$ | $P_2O_5$ | Sагул. | Cl агул. |
| адносная хіб- | 82,61 | 0,81 | 0,62 | 0,03 | 1,46 | 5,83 | 1,01 | 0,51 | 13,71 | – | 13,71 | 0,07 | 0,15 | 0,11 |
| насць, % | 1,0 | 0,2 | 0,5 | 0,05 | – | 0,1 | 0,5 | 0,05 | 0,1 | 0,3 | | 0,05 | 0,05 | 0,05 |

*Табліца 2.* **Хімічны склад шыхты шкла ў мольных %**

| $SiO_2$ | $Al_2O_3 \times 10^{-2}$ | $FeO \cdot 10^{-2}$ | $CaO \cdot 10^{-2}$ | $MgO \times 10^{-2}$ | $K_2O \cdot 10^{-2}$ | $Na_2O \cdot 10^{-2}$ | $(P_2O - PO) \times 10^{-2}$ | $\frac{Al_2O_3}{SiO_2}$ | $\frac{K_2O}{Na_2O}$ | $\frac{K_2O - Na_2O}{SiO_2}$ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1,37 | 0,61 | 0,13 | 10,4 | 2,51 | 14,55 | | 27,59 | 0,004 | – | 0,106 |

*Табліца 3.* **Малекулярны склад шыхты**
**(прыведзены да формулы Зэгерса)**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 0,0047 | | FeO |
| | | | | 0,3769 | | CaO |
| 4,9656 | $O_2$ | 0,0221 | $Al_2O_3$ | 0,0910 | MgO | |
| | | | | 0,5274 | | $K_2O$ |

[160] Архіў Інстытута «Белспецпраектрэстаўрацыя». Аб'ект 406–89. Інв. № 6. *Калнін В.* Комплексныя навуковыя вышукі. Гісторыка-архіўныя і бібліяграфічныя вышукі. Дадатак. 01.01. КВП. Кн. 2. С. 78.

У бярозаўскай калекцыі сустракаецца і іншы вытанчаны посуд. Напрыклад, парфумны флакон (?) XVIII ст. з бэзавага шкла, якое сваёй сегментацыяй стварае вобраз перліны (мал. 15: 3). У XVIII ст. былі ва ўжытку і слоікі светла-зялёнага шкла (мал. 15: 2), у якім бачныя бурбалкі паветра і дамешкі ў фармовачную масу.

## *Металічныя вырабы*

Усю калекцыю металічных вырабаў можна падзяліць на некалькі групаў паводле прызначэння. Асабліва шматлікая група скабяна-будаўнічых прыладаў. Для рэстаўратараў вельмі цікавай будзе дзвярная ручка XVIII ст. з розным на плошчы мацавальнымі пляцоўкамі (мал. 15: 8). Каваныя цвікі XVIII ст. найчасцей маюць простакутні папярэчны разрэз (мал. 15: 11). Вылучаюцца цвікі, што ўжываліся пры мацаванні і аздобе, напрыклад, дзвярэй. Іхнія плешкі навялічаныя да 30 мм у дыяметры (мал. 15: 7). Знойдзены цыркуль пачатку XIX ст. (мал. 15: 6).

Група ўжытковых рэчаў нешматлікая. Латуневая лыжка знойдзена ў слаі канца XVIII – пачатку XIX ст. (мал. 15: 4). Другой паловай XVII пачаткам XVIII ст. датуецца нажык, ручка якога была насаджаная на тронкі (мал. 15: 5). Латуневая пракладка паміж ручкай і працоўнай часткай відавочна пазнейшая. Спінка выступае на 7 мм, рабочая частка моцна спрацаваная.

Сельскагаспадарчы інвентар прадстаўлены дзвюма матыкамі. Адная з іх датуецца XVIII ст. і мае адтуліну для дрэўка ў адной плоскасці з рабочай часткай (мал. 15: 9). Матыка канца XVIII – першай паловы XIX ст. мае плоскасць працоўнай часткі, якая знаходзіцца перпендыкулярна да папярочнага сячэння ўтулкі. Гэтая ж матыка мае адтуліну для цвіка (мал. 15: 10).

Наяўнасць працоўнага інвентару не выпадковая. Вышэй ужо адзначалася вялікая гаспадарчая дзейнасць кляштара, у тым ліку і аграрная: апрацоўка садоў, гародаў, вырошчванне лекавых зёлак. Падчас раскопак была знойдзеная рэч, якая адлюстроўвае яшчэ адну спецыфічную рысу дзейнасці бярозаўскіх картузаў. У літаратуры XIX ст. згадвалася пра развядзенне чарапахаў, да

мяса якіх манахі былі вялікімі ахвотнікамі[161]. На Палессі вядомы тып аўтахтонавай балотнай чарапахі («жоўла» ў палескіх гаворках). Але знойдзены ў слаях XVIII ст. фрагмент панцыра чарапахі належаў не аўтахтону. Гэта панцыр чарапахі сухапутнай, не вельмі маладой, завезенай з-за межаў Беларусі; косць акамянела, значыць чарапаха не выкапнёвая[162] і яе можна датаваць па пласту.

### *Асноўныя высновы па выніках археалагічных даследаванняў*

Аналіз археалагічнай інфармацыі дазваляе прыйсці да наступных высноваў:

1) датаванне найстаражытнейшых матэрыялаў сярэдзінай XVII ст. дазваляе сцвярджаць, што кляштар быў заснаваны на незаселеным месцы;

2) падчас будаўніцтва кляштара тэхнічныя прыёмы будоўлі цесна ўвязваліся з умовамі прыроднага асяроддзя;

3) кляштар мае значна больш складаную архітэктурную гісторыю ў параўнанні з сітуацыяй, што адлюстраваная на планах першай паловы XIX ст.;

4) у матэрыяльнай культуры (у прыватнасці, у керамічным посудзе) адлюстравалася спецыфіка індывідуальнага кляштарнага жыцця;

5) бярозаўскі кляштар картузаў з'яўляецца ўзорным помнікам развіцця матэрыяльнай культуры рэгіёна ў добравызначаных храналагічных межах: сярэдзіна XVII ст. – 20-я гады XIX ст.

---

[161] *Iwanowski E.* Wspomnienia lat minionych. Kraków, 1876. S. 584–585.

[162] Першаснае вызначэнне праведзена ў Інстытуце заалогіі НАН Беларусі. Інфармацыя атрыманая ад С. Драбянкова.



pawet.net